Прес-реліз

для тэрміновай публікацыі

Пятніца 24 мая, 2019 г

Прэмія ADAMI Media Prize за культурніцкую разнастайнасць ва Усходняй Еўропе радая абвесціць вяшчальным кампаніям і тэлежурналістам з шасці краін Усходняга Партнёрства Еўразвязу пра пачатак збору заявак на ўдзел у нашай новай медыя-ініцыятыве - праграме **ADAMI TANDEM**.

Заяўкі на праграму ADAMI TANDEM могуць падаць журналісты, якія працуюць з тэмамі культурніцкай разнастайнасці для вяшчальнікаў краін Арменіі, Азербайджана, Беларусі, Грузіі, Малдовы і Украіны. Праграма дае ўдзельнікам унікальную мажлівасць наладзіць сувязі з заходнееўрапейскімі тэлекампаніямі і вырабляць навіны сумесна з калегамі з ЕЗ.

Журналісты, якія працуюць з тэмамі культурніцкай разнастайнасці для вяшчальнікаў ў краінах Усходняга Партнёрства **(Арменіі, Азербайджане, Беларусі, Грузіі, Малдове і Украіне)** могуць падаваць свае прапановы навінавых сюжэтаў, якія яны маюць намер вырабіць для трансляванння ў сваёй краіне. Працягласць матэрыялаў павінна быць не больш за чатыры хвіліны. ADAMI аб'яднаецца з рэдакцыйнымі журналістамі чатырох заходніх тэлеканалаў, сярод якіх ARTE і Deutsche Welle, каб выбраць лепшыя прапановы.

Сярод тэлеканалаў, якія возьмуць удзел у ініцыятыве, нямецкія ZDF і SWR, франка-нямецкі культурніцкі канал ARTE і Deutsche Welle са сваёй праграмай «Фокус на Еўропе», якая накіраваная на міжнародную аўдыторыю і транслююцца на некалькіх мовах.

Прапановы-пераможцы будуць падрыхтаваныя аўтарамі сумесна з рэдакцыямі вяшчальнікаў з Еўрапейскага Звязу для трансляцыі на абодвух каналах – ва Усходняй і Заходняй Еўропе.

Прыём заявак адкрываецца 24 мая 2019 года.

Прыём заявак сканчаецца **24 чэрвеня 2019 года, у 23:59** па тбіліскаму часу.

Для атрымання больш падрабязнай інфармацыі і рэгістрацыі на конкурс, калі ласка, наведайце наш сайт: https://www.adamimediaprize.eu/adami-tandem

https://form.jotform.me/RegistrationADAMI/adami-tandem-2019

The ADAMI Media Prize for Cultural Diversity is an initiative of
ADAMI Medienpreis gGmbH – Mediencampus Villa Ida – Menckestr. 27 – D 04155 Leipzig – Germany
Funded by the Federal Foreign Office (Germany) and Pro Credit Holding (Frankfurt)
www.adamimediaprize.eu

ADAMI TANDEM арганізуецца ў цеснай супрацы з праграмай партнёрства Еўрапейскага вяшчальнага звязу (EBU), Жэнева.

ADAMI Медыя Прыз фінансуецца Федэральным Міністэрствам замежных справаў Нямеччыны і ProCredit Holding.

Мы вельмі чакаем вашых заявак!

The ADAMI Media Prize for Cultural Diversity is an initiative of
ADAMI Medienpreis gGmbH – Mediencampus Villa Ida – Menckestr. 27 – D 04155 Leipzig – Germany
Funded by the Federal Foreign Office (Germany) and Pro Credit Holding (Frankfurt)
www.adamimediaprize.eu